# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 27 студзеня 2000 года, чацвер, № 1 (1813)


ВІНШУЕМ!

## ЛІЦЭЮ БДУ – 10 ГАДОЎ

У гэтым месяцы ліцэю БДУ спаўняецца 10 гадоў.

З гэтай нагоды напачатку лютага ладзіцца шмат цікавых мерапрыемстваў.

Навукова-практычную канферэнцыю школьнікаў "Першы крок у навуку" плануецца правесці 3 лютага. У спартыўным комплексе БДУ 4 лютага будзе арганізавана спартыўнае свята. А 5 лютага ў канцэртнай зале "Мінск" на святочны канцэрт збяруцца выпускнікі ліцэя за 10 гадоў, выкладчыкі, цяперашнія ліцэісты. Дарэчы, да 1800 выпускнікоў у гэтым годзе далучыцца яшчэ больш за 200. Такім чынам, у 2000 годзе будзе 2000 выпускнікоў!

Зычым усім ліцэістам, выкладчыкам, выпускнікам моцнага здароўя, поспехаў, аптымізму, застацца і надалей лепшымі з лепшых.

Больш падрабязна пра тое, як праходзілі святкаванні, пра гісторыю ліцэя, яго славутых выпускнікоў, пра цяперашняе жыццё ліцэістаў чытайце ў наступным нумары "Беларускага універсітэта". Для тых, хто жадае прыняць удзел у святкаваннях, нагадаем тэлефон ліцэя БДУ: 221-04-10.

*ВольгаСЫРЫЧ*

З НАГОДЫ

## СУСТРЭЧА З ПРАРЭКТАРАМ

Традыцыйнымі сталі сустрэчы студэнцкага актыву з прадстаўнікамі адміністрацыі нашага універсітэта. У снежні мінулага года прарэктар па эканоміцы і камерцыйных пытаннях Сяргей Анатольевіч Чайкун правёў гутарку са старшынямі Савета старастаў факультэтаў. Прарэктар пазнаёміўся з новым саставам Старастата, а маладзёжныя лідэры факультэтаў, у сваю чаргу, атрымалі ад яго інфармацыю аб эканамічнай структуры і фінансавай дзейнасці Белдзяржуніверсітэта.

Падчас сустрэчы абмяркоўвайся шэраг пытанняў: арганізацыйна-фінансавая структура універсітэта, фарміраванне бюджэту, пазабюджэтная эканамічная дзейнасць, самаакупнасць НДР, сувязь навукі з вытворчасцю, навукова-вытворчая база БДУ, сродкі на аднаўленне тэхнікі, праекты БДУ (радыё БДУ) і іншае. Вялікі інтарэс студэнцкія лідэры факультэтаў праявілі да тэмы платнай адукацыі.

*Андрэй САКОЛЬНІК*

У НАШЫМ ДВАРЫ

## АСВЕТНІЦА ЕФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ

Напрыканцы мінулага года ў дворыку універсітэцкага гарадка была ўрачыста адкрыта скульптура "Асветніца Ефрасіння Полацкая".

Амаль год сорак высокапрафесійных спецыялістаў са скульптурнага прадпрыемства "Таварыства Іваноўскага" працавалі над гэтым праектам. Фігура выканана ў бронзе вышынёй 3,5 метры.

Аўтар — скульптар Ігар Голубеў. У Мінску яго кампазіцыю можна яшчэ ўбачыць на плошчы Незалежнасці ля Чырвонага касцёла: архангел Міхаіл, які перамагае змея.

Архітэктар скульптуры "Асветніца Ефрасіння Полацкая" — Віктар Ягадніцкі з Віцебска.

*Вольга АЛЯКСЕЕВА*

ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

## ГІСТОРЫІ СА СТУДЭНЦКАГА ЖЫЦЦЯ

Напэўна, чытачы "Беларускага універсітэта" памятаюць, што ў адным з апошніх нумароў Студэнцкім саюзам БДУ, Камітэтам БПСМ БДУ, Саветам старастаў БДУ быў абвешчаны конкурс сярод студэнтаў і супрацоўнікаў нашага універсітэта "На лепшую гісторыю са студэнцкага жыцця". Падведзены вынікі гэтага конкурсу. Так, у намінацыі "Самая праўдзівая гісторыя" перамагла студэнтка 1-га курса біялагічнага факультэта Ірына Баслык (Ірына Зіміна), прадставіўшы на конкурс у вершаванай форме "Самую праўдзівую гісторыю са студэнцкага жыцця ў і каля інтэрната № 10". Першае месца ў намінацыі "Самая неверагодная гісторыя" заняла студэнтка 5-га курса геаграфічнага факультэта Ганна Пяхота з гісторыямі з жыцця геафака. А "Самай смешнай" прызнана гісторыя студэнта 4-га курса механіка-матэматычнага факультэта Алега Кавальчука пад назвай "Ключы".

Некаторыя з гэтых гісторый чытайце на 6-й старонцы нумара.

*Вольга СЫРЫЧ*

ЯК ЖЫВЕШ, ІНТЭРНАТ?

## № 5 — САМЫ ЛЕПШЫ

Яшчэ ў мінулым годзе ў студэнцкім гарадку прайшоў агляд-конкурс на лепшы інтэрнат БДУ.

Нам нялёгка было перамагчы, таму што ў нас жывуць студэнты з іншых краін. У іх свае традыцыі, свой лад жыцця. Аднак пры умелым кіраўніцтве загадчыка інтэрната № 5 Л.П. Аблаказавай мірна ўжываюцца арабскія, кітайскія, пакістанскія і перуанскія студэнты. Асабліва ім цяжка напачатку навучальнага года. Прыехаўшы ў нашу краіну, яны вымушаны гутарыць з намі толькі з дапамогай студэнта-перакладчыка.

У нашым інтэрнаце падабраны вельмі добры калектыў супрацоўнікаў. Добрасумленныя адносіны да сваёй справы, добразычлівы тон, максімум увагі да кожнага студэнта — інакш не можа быць. Для іх створаны ўсе ўмовы: трэнажорная зала "Кетлер", пакой для самападрыхтоўкі. Па магчымасці дапамагаем ім з метадычнай літаратурай.

У мінулым навучальным годзе добра працаваў савет інтэрната № 5. Старшыня савета — арабскі студэнт Эль Назар Хайсам. Вялікую дапамогу ў выхаванні кітайскіх студэнтаў аказваў староста паверха Цзян Хайшао. Актыўны ўдзел прымалі нашы студэнты ў спаборніцтвах сярод інтэрнатаў па шахматах і тэнісе, дзе занялі 4-е месца.

Студэнтам падабаецца ў нас, па іх словах, ім тут утульна.

Як вынік гэтай працы рашэннем выканаўчага камітэта адміністрацыі Ленінскага раёна інтэрнат № 5 прызнаны лепшым сярод інтэрнатаў Ленінскага раёна горада Мінска.

*Людміла ГУЛЬКО,*
*сацыяльны педагог інтэрната № 5*

ЮБІЛЕЙ

# ЭКАНАМІСТ СУЧАСНЫХ ПОГЛЯДАЎ

Алена Самуілаўна Бялевіч у поўным сэнсе слова дзелавая жанчына. І ў яе ёсць для гэтага ўсе патрэбныя якасці. У першую чаргу, кампетэнтнасць, уменне браць на сябе адказнасць і вырашаць складаныя пытанні. Не апошнюю ролю тут адыгрывае і прафесійная актыўнасць, заўсёднае жаданне валодаць сітуацыяй, што дазваляе адчуць патрабаванне часу.



*Алена Самуілаўна Бялевіч*

Алена Самуілаўна займае даволі высокую пасаду. Яна з'яўляецца начальнікам планава-эканамічнага ўпраўлення Беларускага дзяржаўнага універсітэта. І прыйшла на яе, калі БДУ быў толькі вядучай вышэйшай навучальнай установай, а сёння — гэта адзіны комплекс, у складзе якога вучэбныя, навукова-даследчыя, вытворчыя, сацыяльна-культурныя, адміністрацыйна-гаспадарчыя і іншыя падраздзяленні, з якіх 35 — з правам юрыдычнай асобы.

Ад Алены Самуілаўны ў свой час у многім залежыла, якім чынам і якія новыя структуры пачнуць функцыянаваць у БДУ, а цяпер — як размяркоўваюцца пэўныя фінансавыя сродкі паміж імі. Справа, скажам так, далікатная: Беларускі дзяржаўны універсітэт фінансуецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, якіх пастаянна не хапае. Аднак Алена Самуілаўна гаворыць, што размяркоўваць грошы паміж пэўнымі структурамі не так ужо і цяжка, калі прытрымлівацца правілаў і нарматыўнай дакументацыі. Тым больш, што рэктарат заўсёды ідзе насустрач, а рэктар Аляксандр Уладзіслававіч Казулін у стане даказаць у Міністэрстве фінансаў, Міністэрстве працы, Камітэце па навуцы і тэхналогіях, што сродкі патрэбны і прынясуць у будучым свой плён.

На пытанне, чаго яна больш хацела ў юнацкія гады — кар'еры дзелавой жанчыны ці добрай сям'і, Алена Самуілаўна паціскае плячыма і гаворыць, што нічога такога не загадвала. Ва ўсякім разе ёй удалося і тое, і гэта.

У Навагрудку, дзе яна нарадзілася, у пашане былі прафесіі ўрача і настаўніка. І яна, як дзяўчынка, якая вучылася на пяцёркі, спадзявалася, што на адну з іх вывучыцца. Але бацькі вырашылі, што дачка скончыць менавіта фінансава-эканамічны тэхнікум у Навагрудку. Потым быў інстытут народнай гаспадаркі ў Мінску. А пазней — і ўсе выпрабаванні лёсу бухгалтара.

Паколькі крыху даводзілася сутыкацца з бухгалтарамі, магу сказаць, што ў большасці сваёй гэта людзі нетаварыскія, закрытыя, амаль заўсёды прадказальныя ў паводзінах і цяжкія ў зносінах. Алена Самуілаўна Бялевіч зусім іншая. Яна прыемная, гаваркая, умее выклікаць сімпатыю ў суразмоўцы. Аднак прафесія накладвае свой адбітак на кожнага. І Алена Самуілаўна не зусім згодна з тым, што яна чалавек адкрыты. Тут жа тлумачыць, што не вельмі любіць расказваць аб сваіх перажываннях. Не ў яе характары і "лезці ў душу" іншаму. Калі яна прыходзіць на працу і бачыць, што яе падначалены сядзіць надзьмуты, хмуры, то ніколі не будзе "чапляцца" да яго. Бо лічыць, што кожнаму чалавеку патрэбен час, каб перажыць непрыемнасць. Аднак тады, калі ён звяртаецца за дапамогай, яна заўсёды выслухае і падтрымае. Алена Самуілаўна канстатуе, што ёй шанцавала з падначаленымі. І тады, калі працавала галоўным бухгалтарам у Міністэрстве адукацыі, і зараз — начальнікам планава-эканамічнага ўпраўлення БДУ. Ва ўсіх бухгалтараў, на яе думку, з гадамі выпрацоўваюцца вельмі добрыя якасці, якім можа пазайздросціць любы чалавек з іншай прафесіяй. Гэта дакладнасць у рабоце, сумленнасць, веданне справы, стараннасць, адказнасць. У яе ўладзе толькі застаецца захапіць сваіх супрацоўнікаў працай. А Алена Самуілаўна гэта рабіць умее. Як набрала некалі "абароты" актыўнасці, дык цяпер спыніцца не так ужо і лёгка. Канешне, магла б крыху і менш ускладваць на сябе абавязкаў, але цяжка адмовіць, калі ведаеш, што ты гэта можаш зрабіць. А значыць, патрэбна.

Адзінае, аб чым шкадуе, што мала ўдзяляла часу сваім блізкім: частыя камандзіроўкі, пастаянная занятасць. Аднак сям'я ў яе цудоўная: муж, дзеці Людміла і Віталь... Яна ганарыцца сваімі ўнукамі... Часу ўдзяляла мала, але заўсёды старалася іх зразумець, падтрымаць.

Хоць Алена Самуілаўна Бялевіч — эканаміст, і доўгі час працуе на кіруючых пасадах, яе нельга назваць "жалезнай лэдзі". Яна ніколі не баіцца памыліцца. Любую сітуацыю можна выправіць, а значыць, ёсць выйсце, і непрыемнасці — гэта не страшна. Яна не любіць хаваць сваіх эмоцый. Калі хоча смяяцца — смяецца, калі кепскі настрой — наадварот.

Алена Самуілаўна — дзелавая жанчына, сапраўдная ва ўсіх сваіх праяўленнях. Няхай гэта будзе на рабоце, дома ці ў коле блізкіх сяброў.

*Ганна АНАТОЛЬЕВА*

АБ'ЯВЫ


**УСТАНОВА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА "НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ ФІЗІКА-ХІМІЧНЫХ ПРАБЛЕМ"**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

• старшага навуковага супрацоўніка лабараторыі экстракцыі і іанаметрыі;
• навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі кандэнсаваных асяроддзяў;
• малодшага навуковага супрацоўніка лабараторыі тэрмадынамікі арганічных рэчываў;
• малодшага навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі тонкіх плёнак і фотатэхналогіі;
• малодшага навуковага супрацоўніка лабараторыі раствораў цэлюлозы і прадуктаў іх перапрацоўкі (дзве вакансіі);

Тэрмін падачы дакументаў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Дакументы прымаюцца па адрасе: 220050, г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, аддзел кадраў НДІ ФХП БДУ.

**РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

• загадчыка Навукова-даследчай лабараторыі беларускага фальклору і дыялекталогіі — 1.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 9, Белдзяржуніверсітэт, Навукова-даследчая частка, упраўленне кадраў, пакоі 406, 407, тэл. 226-47-64.

# НА ЭКАНАМІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ — НОВАЯ КАФЕДРА

*На эканамічным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта з'явілася новая кафедра – банкаўскай і фінансавай эканомікі.*

Напрыканцы снежня 1999 года Вучоным саветам універсітэта быў выбраны на пасаду загадчыка новай кафедры доктар эканамічных навук, прафесар Уладзімір Іванавіч Тарасаў, які каля дваццаці год адпрацаваў у Інстытуце эканомікі НАНБ, працаваў таксама ў Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь, у Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце.

Наш карэспандэнт звярнулася да Уладзіміра Іванавіча, каб даведацца пра асноўныя мэты і задачы кафедры.

— Кафедра банкаўскай і фінансавай эканомікі з'яўляецца адметнай кафедрай сярод эканамічных кафедраў вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь. Яе спецыфіка — аб'яднанне ў рамках адной кафедры двух важнейшых дзяржаўных блокаў: фінансавага і банкаўскага. Выкладчыкі кафедры будуць даваць студэнтам паглыбленыя веды як па тэорыі грошай, крэдыту і банкаўскай справы, так і па фіскальна-бюджэтнай сістэме. Асаблівая ўвага будзе надавацца механізмам функцыянавання і параўнаўчаму аналізу сучасных банкаўскіх і фінансавых сістэм вядучых краін свету.

Наш выпускнік павінен быць здатным для працы ў замежных банкаўскіх фірмах і прадстаўніцтвах. У ходзе навучання студэнты атрымліваюць веды аб спецыфіцы дзеяння падаткавых і бюджэтных сістэм, фінансавых рынках і інвестыцыйнай палітыцы, банкаўскім і фінансавым менеджменце. Вялікая ўвага надаецца спецыяльным курсам: па валютнаму рынку і валютным рэгуляванні, фінансавым праграмаванні і аналізе, менеджменце страхавання, кіраванні банкаўскімі рызыкамі і г. д.

Студэнты будуць аналізаваць альтэрнатыўныя варыянты прыняцця аптымальных інвестыцыйных рашэнняў. У цэлым дзейнасць кафедры банкаўскай і фінансавай эканомікі накіравана на падрыхтоўку высокакваліфікаваных эканамістаў, якія валодаюць пытаннямі тэорыі і практыкі ў банкаўска-фінансавай сферы. Пачалася таксама падрыхтоўка магістраў і аспірантаў па спецыяльнасці "фінансы і крэдыт".

*Вольга АНІНА*



# Імем прафесара

*Адна з аўдыторый факультэта радыёфізікі і электронікі названа імем Заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі БССР, прафесара БДУ Іллі Рыгоравіча Некрашэвіча, які паклаў пачатак фізічным і радыёфізічным даследаванням у Беларусі і ў тым ліку ў БДУ.*



Адкрыццё мемарыяльнай дошкі І.Р. Некрашэвічу на факультэце радыёфізікі і электронікі БДУ

Надпіс на дошцы:

"Аудитория
имени Заслуженного деятеля науки и техники БССР,
профессора Белорусского государственного университета
НЕКРАШЕВИЧА
Ильи Григорьевича

Педагогическая и научная деятельность в Белгосуниверситете:
1923—1928 — студент физико-математического отделения;
1928—1937 — аспирант, ассистент, доцент;
1937—1980 — зав. кафедрой физического и радиофизического факультетов;
1980—1993 — профессор кафедры физической электроники".

Рашэнне назваць імем вядучага вучонага-фізіка аўдыторыю прыняў Вучоны савет факультэта. І гэта не дзіўна. Ілля Рыгоравіч Некрашэвіч шмат зрабіў для беларускай радыёфізікі наогул, і для радыёфізічнага факультэта ў прыватнасці. Ён аддаў Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту 70 гадоў свайго жыцця.

На адкрыццё мемарыяльнай дошкі сабраліся члены Вучонага савета, вучні Іллі Рыгоравіча, яго калегі, родныя: дачка, сын, унучка, праўнук. Спыняліся ля аўдыторыі студэнты факультэта. Ім не пашчасціла слухаць лекцыі Іллі Рыгоравіча, але яго імя яны, безумоўна, чулі.

Шмат добрых слоў гучала ў адрас Іллі Рыгоравіча. Шчырых, сардэчных. І ўспаміналі не столькі яго заслугі як навукоўца, а больш гаварылі як пра выкладчыка і чалавека. Слова бралі дэкан факультэта прафесар Сцяпан Рыгоравіч Мулярчык, прафесар Антон Антонавіч Лабуда, былы вучань Іллі Рыгоравіча, прафесар, член-карэспандэнт Акадэміі навук Пётр Дзмітрыевіч Кухарчык. Псіхолагі сцвярджаюць, што чым больш паважаеш і любіш чалавека, тым часцей хочацца называць яго імя. Дык кожны выступаючы пачынаў свой кожны сказ з імя Іллі Рыгоравіча.

Іллі Рыгоравіча няма сярод нас ужо больш за шэсць гадоў, але яго звычкі засталіся на факультэце радыёфізікі. У гады вайны ён пачаў аднаўляць старую апаратуру і захоўваў, захоўваў, захоўваў. Многія кабінеты застаўлены ўсім, чым толькі магчыма, патрэбным і не зусім. Але ўсе гэтыя рэчы шануюць, як гэта рабіў ён.



І.Р. Некрашэвіч. 1944 г.

Калі б не было Іллі Рыгоравіча, то фізіка ў БДУ развівалася б іншым, больш цяжкім шляхам. Бо ў Беларусі пасля вайны было няшмат фізікаў, і ўсе яны слухалі лекцыі прафесара Некрашэвіча.

Яго навуковыя ідэі працягваюць развівацца намаганнямі вучняў і паслядоўнікаў, прыносячы адчувальную карысць роднай Беларусі, грамадзянінам якой ён быў і якая яго памятае.

*Вольга КУЛІКОВА*

АКТУАЛЬНА

*Ідзе сесія... Галаўны боль студэнтаў... Некалькі дзён – і адпачынак. Трымайся, студэнт! Нядоўга засталося. Апошняе намаганне... і доўгачаканыя канікулы. На нейкі час можна забыць пра канспекты і лекцыі. Не абавязкова рана ўставаць і спяшацца ва універсітэт, можна заняцца любімай справай ці паехаць дадому. Але сцеражыцеся, двоечнікі! У вас усяго некалькі дзён, каб выправіць свае адзнакі і не застацца без стыпендыі...*



СЛУЖБА 02

# ПАРАДЫ НА КОЖНЫ ДЗЕНЬ

На пытанне: "Як прадухіліць крадзёж з кабінета?" — не заўсёды можна пачуць выразны і дакладны адказ. На вялікі жаль, здзяйсненню крадзяжоў садзейнічаюць самі пацярпелыя, праявіўшы асабістую бестурботнасць, а іншы раз і разявацтва ў адносінах да сваёй маёмасці.

У інтарэсах Вашай абароны і прадухілення злачынстваў аддзел прафілактыкі Маскоўскага раёна рэкамендуе:

- калі Вы згубілі ключы ад кабінета, замяніце асяродак замка;
- не пакідайце нават на вельмі кароткі час кабінет адчыненым;
- не перадавайце ключы пабочным асобам;
- выходзячы з кабінета, хавайце вялікія сумы грошай, каштоўныя паперы і каштоўнасці ў сейф або забірайце з сабою;
- разам з калегамі па рабоце выявіце асоб, якія, нічым не займаючыся, ходзяць па калідорах арганізацый, установ і зазіраюць у кабінеты;
- не прымайце на працу асоб, якія парушаюць грамадскі парадак і працоўную дысцыпліну;
- абсталюйце службовыя памяшканні, кабінеты ахоўнай сігналізацыяй, надзейнымі замкамі, сігналамі трывогі.

*Вікторыя МАЛЫШКА,*
*супрацоўнік Маскоўскага РУУС*

ВЕСТКІ З БІБЛІЯТЭКІ

# *У сяброўстве з кнігай*

Бібліятэка — гэта не толькі сховішча кніг, а яшчэ і культурны, духоўны цэнтр для развіцця асобы і арганізацыі вольнага часу студэнтаў.

Уступаючы ў дыялог з моладдзю, мы, супрацоўнікі бібліятэкі, арыентуемся на тыя праблемы, якія хвалююць маладое пакаленне. Гэта адвечныя праблемы жыцця і смерці, чалавечай годнасці і абавязку, сумлення, кахання, пошуку мэты і г. д. Менавіта з кніг, з лепшых твораў мастацкай літаратуры мы бяром прыклады для духоўнага выхавання моладзі.

Педагог-арганізатар Клімковіч Ірына Іванаўна і калектыў сацыяльных педагогаў студэнцкага інтэрната № 7 з'яўляюцца нашымі аднадумцамі і памочнікамі ў правядзенні сумесных мерапрыемстваў.

Вынікам такога супрацоўніцтва стаў творчы вечар з пісьменнікам Валерыем Касьянчыкам, дзе гучалі не толькі вершы, але і ішла сур'ёзная, даверлівая размова на тэму, што нас хвалюе і што губляем на шляху ў XXI стагоддзе.

Юбілей Пушкіна быў адзначаны цудоўнай вечарынай "Мы рождены для вдохновенья...", якая прайшла ў форме інтэлектуальнай гульні.

Турнір інтэлектуалаў, які адбыўся ў снежні ў актавай зале студэнцкага інтэрната № 7, сабраў вялікую аўдыторыю і ўдзельнікаў, і балельшчыкаў. У турніры пажадалі ўдзельнічаць дзве каманды: "Вікторыя" і "Эльфы" — студэнты механіка-матэматычнага і філалагічнага факультэтаў. Турнір складаўся з 12 конкурсаў. Пытанні былі ўзяты з розных галін ведаў: літаратуры, мастацтва, гісторыі, геаграфіі, эканомікі. Каманды паказалі сябе бліскучымі эрудытамі. З невялікім адрывам перамагла каманда "Эльфы".

Аднак, гэтыя мерапрыемствы ахопліваюць толькі невялікую частку студэнцкай аўдыторыі. А як важна шмат чытаць, і, такім чынам, шмат ведаць. Універсітэцкая бібліятэка мае дастаткова вялікі фонд, у тым ліку навукова-пазнавальную, даведачную літаратуру, якая так неабходна для павышэння інтэлектуальнага ўзроўню студэнтаў. Гэта кнігі з серыі "Што? Дзе? Калі? Як? Чаму? Навошта?", кнігі пазнаваўча-забаўляльнага зместу.

Таму, каб прыцягнуць увагу да літаратуры, да паэзіі, да працы з кнігамі, мы запрашаем да супрацоўніцтва педагогаў-арганізатараў, сацыяльных педагогаў, ініцыятыўных студэнтаў — усіх, хто зацікаўлены гэтай нялёгкай, але творчай і цікавай працай. Наш адрас: вул. К.Маркса, 31, БДУ, бібліятэка, аддзел бібліятэчнай рэкламы, тэл. 222-36-14.

*Людміла ЯНКОВІЧ,*
*Тамара ЛАРКОВА*




*Падчас турніру інтэлектуалаў у інтэрнаце № 7*

# Беларус — заснавальнік навуковай картаграфіі ў Расіі

Для вырашэння сваіх грандыёзных задач на ўсходзе эпоха Пятра Вялікага патрабавала развіцця навуковай картаграфіі.

Па загаду Пятра І ад 14 студзеня 1701 года ў Маскве адкрываецца матэматыка-навігацыйная школа для вывучэння мараходных навук, размешчаная ў Сухаравай башні. Для выкладання ў школе быў прызваны матэматык-самародак Лявонцій Піліпавіч Магніцкі (1669 — 1739).

У Маскоўскую школу прымалі да 500 хлопцаў ва ўзросце 12-20 гадоў. Праграма навучання была без вызначанага тэрміну — вучні пераходзілі з класа ў клас па меры "засваення навук". Вучняў забяспечвалі падручнікамі, дапаможнікамі, інструментамі. Саслоўны склад навучэнцаў быў стракаты, і вучыліся яны таксама па-рознаму. Такой была першая навуковая ўстанова ў Расіі, якая ўвайшла ў гісторыю як калыска расійскай картаграфіі.

26 мая 1714 года Пётр І запатрабаваў з Масквы ў Пецярбург 20 лепшых вучняў старэйшых класаў матэматыка-навігацыйнай школы для заснавання ў Расіі і першай ў Пецярбургу новай навучальнай установы — Марской акадэміі на "300 асоб". Маскоўская школа была раздзелена на дзве часткі — малодшыя класы засталіся ў Маскве, старэйшыя пераводзіліся ў Пецярбург для навучання марской справе.

Першы выпуск марскіх афіцэраў і геадэзістаў адбыўся ў 1719 годзе, але яшчэ раней, 28 мая 1718 года, самы лепшы вучань геадэзічнага класа — Іван Міхайлавіч Яўрэінаў "з баярскіх ліцвінаў", родам з Мсціслаўля, — па асабістым загадзе Пятра І быў узяты з акадэміі і ў пачатку 1719 года пасланы на Курыльскія астравы.

Іван Яўрэінаў пачынаў вучобу ў Лявонція Магніцкага ў Маскве і, як лепшы вучань у старэйшым класе, стаў першым сярод 20 вучняў для Пецярбургскай марской акадэміі. У Пецярбургу ён адразу ж быў залічаны ў самы складаны па навуках геадэзічны клас, вучыўся вельмі добра і раней часу авалодаў у поўным аб'ёме геадэзічнымі навукамі.

Перад адпраўкай экспедыцыі Пётр І доўга размаўляў з Іванам Яўрэінавым. Пасля гэтай размовы была складзена "інструкцыя", якую правіў сам Пётр І.

Пётр І хацеў замаскіраваць назначэнне экспедыцыі Яўрэінава на Курылы заданнем даведацца "ці сышлася Амерыка з Азіяй".

Гэтая экспедыцыя ішла "пад сакрэтам", каб не зрабіць вядомым для іншаземцаў зручны шлях ад Кітая і Японіі ўздоўж Курыл на Камчатку.

Пасля наладжвання ў 1716 годзе пастаянных марскіх сувязей паміж Ахоцкім астрогам і Камчаткай, на Ціхім акіяне хутка з'явіліся рускія марскія судны з вопытнымі мараходамі — выпускнікамі Пецярбургскай марской акадэміі. Магчымасць аснашчанай экспедыцыі на Курылы ўзрасла. І Пётр І вырашыў пасляць на астравы выдатнага геадэзіста Івана Яўрэінава "для описания отдалённых мест Сибири и водного пути в Японию".

У маі 1720 года Яўрэінаў прыбыў у Якуцк, а праз чатыры месяцы — на Камчатку, дзе і вырашыў перазімаваць. 22 мая 1721 года экспедыцыя на судне выйшла ў адкрытае мора і накіравалася да Курыльскіх астравоў. Узнавіць маршрут экспедыцыі дазваляе карта Яўрэінава і яго справаздача, дзе ўказаны каардынаты 14 Курыльскіх астравоў і адлегласці паміж імі ў мілях. Усю сваю астраномагеадэзічную работу Яўрэінаў праводзіў "ад вострава да вострава" і выканаў яе за два месяцы.

30 лістапада 1722 года Яўрэінаў прадставіў Пятру І сваю справаздачу з пералікам пунктаў Сібіры, Камчаткі і Курыл, з іх геаграфічнымі каардынатамі, адлегласцямі паміж імі і карту Курыльскіх астравоў.

Іван Яўрэінаў стаў піянерам навуковай картаграфіі ў Расіі на зары станаўлення рускай картаграфіі. Каталог апорных пунктаў, па якіх ён вызначаў геаграфічныя каардынаты на вялікай прасторы Сібіры і Далёкага Усходу — ад Табольска да Камчаткі, разам з Курыламі — уключае 47 кропак з надпісам: "Гэты каталог пісаў Іван Яўрэінаў 30 дня 1722 года. Геадэзіст Іван Яўрэінаў руку прыклаў".

Шыроты пунктаў і адлегласці паміж імі Яўрэінаў вызначыў даволі правільна — у 12 пунктах з 47 значэнні шырот адрозніваюцца ад сучасных не больш за 10 мінут (!). Што тычыцца даўгаты, то яна скажана больш. Але ж гэта работа Яўрэінава была першым вызначэннем геаграфічных каардынат на вялікай тэрыторыі Расіі.

З прывязкай да сваіх апорных пунктаў Іван Яўрэінаў склаў першую адносна дакладную карту вялікай тэрыторыі Расіі — ад Урала да Ціхага акіяна. Доўгі час арыгінал гэтай сапраўды гістарычнай карты быў згублены ў архівах і толькі ў 1945 годзе быў знойдзены ў Маскве.

Навуковае значэнне карты Яўрэінава велізарнае. Упершыню ў практыцы сусветнай картаграфіі яна дала параўнальна дакладнае выяўленне вялікіх тэрыторый Сібіры, Камчаткі і Курыльскіх астравоў. Яна стала асновай для складання больш позніх карт, расійскіх і сусветных. Нарэшце, карта Яўрэінава сцвярджае расійскі прыярытэт у навуковым даследаванні Курыл і іх картаграфаванні. Гэтая карта адкрыла Курыльскія астравы для сусветнай картаграфіі. Іван Яўрэінаў абверг уяўленні заходнееўрапейскіх мараплаўцаў і географаў аб тым, што ў раёне Курыл нібыта знаходзіцца заходні бераг Амерыкі.

Веліч подзвігу Івана Яўрэінава заключаецца ў тым, што пры складанні першай карты гэтых астравоў ён "руку прыклаў", і было ўсё гэта далёка не проста — "каралі" Курыльскіх астравоў паміж расійскай Камчаткай і японскім Хакайда расцягнуліся на 1200 кіламетраў. І ўся гэтая тэрыторыя не была адзінай, а складалася з 30 значных і мноства дробных астравоў. Клімат тут вельмі халодны. Гэта самы цяжкі ўчастак для землепраходцаў.

У 1875 годзе няўдалыя валадары царскай Расіі ўступілі Курылы японцам і астравы былі ператвораны ў базу агрэсіі супраць Расіі. Толькі ў 1945 годзе Курыльскія астравы былі вернуты расійскаму народу. Курыльскія астравы, адкрытыя (ліцвін Іван Казырэўскі), пакладзеныя на карту (ліцвін Іван Яўрэінаў) і даследаваныя расіянамі, належаць Расіі.

А які ж лёс таленавітых і смелых? Іван Казырэўскі апынуўся ў маскоўскай турме, і магіла яго невядома. Магіла Івана Яўрэінава ў Вятцы таксама невядома. Але народ не забыў сваіх сыноў. Імем Івана Казырэўскага на Курылах названы мыс і адзін з вулканаў, ёсць пасёлак Казырэўск на Камчатцы. На Курылах ёсць праліў Івана Яўрэінава, а на паўночным беразе Ахоцкага мора — мыс Яўрэінава. На ўсе часы ў гэтых назвах захаваецца памяць аб адважных землепраходцах. Яны адкрылі Курыльскія астравы і далучылі іх да Расійскай дзяржавы. Падзвіжніцтва двух Іванаў з Беларусі сцвярджае на ўсе часы: законны спадкаемец Курыльскіх астравоў — Расія. Іх памятае Расія, іх памятае Беларусь!

*В.А. ЯРМОЛЕНКА,*
*доктар геаграфічных навук*

*Алег КАВАЛЬЧУК*

# Ключы

Адбылося гэта ў лютым мінулага года. У майго сябра-мінчаніна быў дзень нараджэння. Цэлую ноч святкавалі, а ўранку пачалі разыходзіцца. Вяртаюся я раніцай да сябе ў інтэрнат № 7. Прайшоў інтэрнаты тэхналагічнага універсітэта, спусціўся з горачкі і на мосце праз Свіслач сустрэў знаёмага хлопца. Прывіталіся з ім, пагаварылі; ён, аказваецца, ішоў на заняткі. Толькі мы разышліся, як мне ў галаву прыйшла цудоўная думка. Павярнуўся я да яго і наўздагон крыкнуў: “Гэй, Дзяніс, стой! Дай мне ключы ад пакоя — хачу на камп’ютэры пагуляць”. “Добра, лаві”, — сказаў ён і кінуў мне ключы. Трэба заўважыць, што мы стаялі адзін ад аднаго на адлегласці 10 метраў, ды я, разумееце, быў не вельмі цвярозы. Я выкінуў наперад правую руку і хацеў злавіць ключы, а атрымалася, што я па іх ударыў. І ключы, замест таго, каб аказацца ў маёй руцэ, упалі на лёд Свіслачы, акурат пасярэдзіне ракі. “Пашанцавала табе, што зараз лёд. Ідзі даставай ключы”, — пачуў я.

Падышлі мы з Дзянісам да берага. А бераг там зроблены з бетону, узвышаецца над вадою амаль на метр. Не ведаю чаму, але гэты лёд мне адразу не спадабаўся. Але што ж рабіць? Сеў я каля ракі, праверыў на трываласць лёд, пастукаўшы па ім адной нагою, потым чамусьці яшчэ і другой. “Дык чаго ты баішся? Ідзі хутчэй за ключамі”, — рашуча падштурхоўваў мяня Дзяніс. Ну я і пайшоў... Я зрабіў толькі першы крок, калі зразумеў, што паспяшаўся. Лёд каля берага аказаўся зусім не моцным. Ён трэснуў, і я, зусім таго не жадаючы, апынуўся ў вадзе. Добра, што там было неглыбока: намоклі толькі ногі... Але і гэта мне падалося вельмі непрыемным. “Дай руку”, — крыкнуў я Дзянісу і выбраўся на бераг. Пакуль я выліў ваду з ботаў, мне стала вельмі холадна. А Дзяніс кажа: “Карацей, я пайшоў на заняткі. А калі прыйду, ключы павінны быць у мяне. Ты пакуль ідзі сагрэйся ў інтэрнат, а то захварэеш”. Я, канешне, адразу пабег у інтэрнат. Цяжка перадаць выразы твараў студэнтаў і студэнтак, перад якімі я прадстаў у такім выглядзе. Добра, што сярод іх не было ніводнага знаёмага. Але яшчэ болей здзівіла наша вахцёрка, якая не пазнала мяне.

— Малады чалавек, а вы гэта да каго? — пачуў я строгі голас, калі, схіліўшы галаву, хацеў хутчэй праскочыць праз вахту.

— Дык я — гэта ж я! — як я не хацеў, але мне прыйшлося павярнуцца да яе тварам.

— А што гэта з вамі такое?

Мабыць, ёй не часта даводзілася бачыць зімою студэнтаў у мокрых штанах.

— Ды гэта так, выпадкова, — адказаў я і пабег да ліфта, не заўважаючы, што на твары вахцёркі з’явілася яшчэ большае здзіўленне.

У пакоі мне прыйшлося перанесці істэрычны рогат майго сябра Сашы. Але пасля таго, як я абагрэўся, пераабуўся і пераапрануўся, я ўгаварыў Сашу дапамагчы мне, і мы адправіліся за ключамі. У нас склаўся геніяльны план: мы вырашылі адламаць галінку якога-небудзь дрэва і падчапіць ёю металічнае кольца, на якое былі надзеты ключы. Галінку мы хутка адламалі — пашанцавала, што дрэвы раслі недалёка. Але калі мы захацелі падчапіць ключы, дык зразумелі, што гэта нам не ўдасца. Калі тонкі канец галінкі трапляў у кольца, і мы яе крыху прыпадымалі, ключы, быццам здзекваючыся з нас, паволі саслізгвалі. Тады мы вырашылі, што падпіхнём ключы галінкай да берага і так забяром іх. А лёд, трэба сказаць, быў пакрыты тонкім пластом снегу. Таму за адзін штуршок ключы перасоўваліся не больш, чым на 5-10 сантыметраў. Але яшчэ больш смешна выглядала тое, як мы гэта рабілі. Аднаму з нас адначасова і трымаць немалую галінку, і штурхаць ёю ключы было вельмі цяжка. Таму Саша трымаў за верх галінку, накіроўваў і загадваў мне, калі штурхаць, а я, прасунуўшы рукі пад поручні моста, перамяшчаўся на каленях, па загаду Сашы штурхаў галінку наперад. З горам папалам, дзесьці праз гадзіну ад пачатку нашых актыўных дзеянняў, ключы аказаліся каля берага. Я расцягнуўся на бетоне, але так і не змог іх дастаць. Але ж мы хлопцы кемлівыя. Саша схапіў мяне за адну нагу і трымаў, пакуль я не ўзяў гэтыя злашчасныя ключы. Добра, падумалася мне тады, што ёсць у нас моцныя хлопцы. Слабы мог бы і не ўтрымаць...

P.S. А я ўсё ж такі нагуляўся на камп’ютэры ў той слаўны лютаўскі дзень.

*Ирина ЗИМИНА*

## САМАЯ ПРАВДИВАЯ ИСТОРИЯ ИЗ СТУДЕНЧЕСКОЙ ЖИЗНИ В И ВОЗЛЕ ОБЩЕЖИТИЯ № 10

Вы, наверное, слыхали
Об общаге номер десять,
Той, стоящей одиноко,
Как в тумане грустный еж?

Так житьё парадоксально.
Вот, допустим, света нету,
Так с утра у всех стабильный
(И довольный) недосып.

А бывает, к Вам заходят
На минутку за конспектом,
А к утру варенье тает
И над ухом чей-то храп.

Если днем Вы захотите
Отыскать общагу в поле,
То, конечно, по окраске
Отличите от столба.

А вот если темной ночью
Вам найти ее приспичит,
То, я думаю, Вы вряд ли
Доберетесь до нее.

Дело тут не в Вашем зренье —
Просто “хитрые” шахтеры
Люки вскрыли по дороге...
Что, дошлялись по ночам?

Все-таки дойдя до цели,
Не пугайтесь, обнаружив
Распростертые объятья,
Закрывающие вход.

Вы ведь знаете: в общаги
Беспрепятственно пускают
Только резвых тараканов
И продукты — но не Вас!

Игнорируя вахтершу,
Гордо голову вздымайте
И, как будто так и надо,
Нагло прите напролом.

Или тапочки обуйте,
Припасенные досрочно:
Покурить, мол, только вышел,
Возвращаюсь вот назад.

Без потерь иль с таковыми,
Но, прорвавшись сквозь преграды,
Постарайтесь все порядки
Неуклонно соблюдать.

Первым делом отнесите
Что-нибудь (цветы, к примеру)
Нашему оперотряду —
Вдруг понравитесь Вы им.

Забредя к кому-то в гости,
Съешьте все, что только можно,
Чтоб негодных тараканов
Голодухой уморить.

В лифт одни не заходите,
Пренебрегши коллективом, —
Ведь гораздо интересней
Ввосьмером лифтера ждать.

В роще поздно не гуляйте:
Там, по парам все разбившись,
Изучают, полагаю,
Флору-фауну, грибы...

В общем, сами приходите,
Посмотрите, поживите,
Если долго проживете —
Настоящий Вы Студент.

Вы, наверное, слыхали
Об общаге номер десять,
Той, что с виду одинока?..



# Песня ў падарунак

Праграма навагодняй і каляднай вечарыны, што адбылася на геафаку ў канцы снежня, прадугледжвала традыцыйную дыскатэку і тэатралізаваную частку — пастаноўку навагодняй казкі. Зразумела, што не абышлося без падарункаў.

Усё мерапрыемства пачалося а 19-й гадзіне з пастаноўкі казкі. Была яна даволі цікавая па задумцы і прываблівала добрай акцёрскай ігрой. Гледачам спадабаліся амаль двухметровая "Дзюймовачка" і "Карлсан", "Брэменскія музыканты" Пухавіцкага раёна, якія з вялікім задавальненнем "танцуюць свае песні", бо ўсе яны шчыра імкнуліся зрабіць атмасферу сапраўды святочнай, парадаваць гледачоў. Прысутныя апладзіравалі і сімпатычнай Бабе-Язе, якая з усіх сіл імкнулася развесяліць публіку. Акцёрскае майстэрства ўсіх удзельнікаў вечарыны было на традыцыйна высокім узроўні, ад якога не адставаў і ўзровень музычнага афармлення. Так, Снягурка спадабалася гледачам настолькі, што яны, нягледзячы на ўсе заклікі вядучага, сталі з самага пачатку клікаць менавіта яе, а не Дзеда Мароза.

Спадабаліся гледачам і гульні з Дзедам Марозам і Снягуркай напрыканцы вечарыны, перад дыскатэкай. Але перад гэтым усе прысутныя атрымалі падарункі ад калектыву "Тутэйшая шляхта", шырока вядомага і любімага не толькі на геафаку і ў БДУ, але і ў нашай краіне і замежжы.

"Тутэйшая шляхта" даволі часты госць на геафаку. Гурт прымаў удзел у мінулагодніх калядных вечарынах, народным свяце гукання вясны. У яго складзе — значная колькасць артыстаў-географаў: лабарант кафедры сацыяльна-эканамічнай геаграфіі Беларусі Ларыса Іосіфаўна Сарафіновіч, студэнты дзённага аддзялення Вадзім Грышчанка і Яўген Мельнік, студэнткі-завочніцы Вера Жыбуль, Аксана Гетц, Марыя Семяжон. Але "Тутэйшую шляхту" любяць на факультэце не толькі за гэта. Вялікае ўражанне пакідаюць цудоўныя касцюмы і разнастайны рэпертуар гурта! Зразумела, што такі калектыў не можа не прываблівань гледачоў. "Тутэйшая шляхта" падабаецца і тым, хто ўжо добра знаёмы з творчасцю гэтага калектыву, і тым, хто сустракаецца з ім упершыню. Таму выступленне на святочным вечары было ўспрынята залай як сапраўдны падарунак.

Пасля вечарыны мне ўдалося пагутарыць з Віктарам Ахраменкам — дацэнтам кафедры матэматыкі і матэматычнай фізікі фізфака БДУ і адначасова салістам "Тутэйшай шляхты". Ён, нягледзячы на занятасць і перадсвяточны час, пагадзіўся адказаць на пытанні пра калектыў і яго творчасць.

**— Вы пачыналі "гукаць вясну" на геафаку. Як потым склаўся для вас гэты год?**

— Пасля гэтага адбылася падзея, якая вельмі нас парадавала — у "Тутэйшую шляхту" прыйшла моладзь як з геафака, так і з іншых факультэтаў. Другой важнай з'явай стаў зняты на Беларускім тэлебачанні відэафільм, які паказвалі ў пачатку лістапада. А ў верасні мы былі на фестывалі "Экафольк" у Харкаве. Добра там сябе паказалі, спадабаліся гледачам, атрымалі цікавыя прапановы прыняць удзел у іншых фестывалях.

**— А што вас звязвае менавіта з геафакам?**

— Геафак мы ўсе лічым сваім родным факультэтам, гурт існуе з 1994 года. І ў першыя гады нам дала прытулак кафедра сацыяльна-эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці, за што хочацца падзякаваць яе загадчыцу Людмілу Васільеўну Казлоўскую. У той час нас вельмі падтрымліваў геафак. Зразумела, што цяпер нам дапамагае і адміністрацыя БДУ, у нас з'явілася свая база ва універсітэце, за што хочацца выказаць падзяку рэктарату, які падтрымлівае "Тутэйшую шляхту", і ўсім, хто клапоціцца пра нас. Але мы памятаем факультэт, дзе нас заўсёды добра прымалі і ўспрымалі, таму з вялікім задавальненнем выступаем на геафаку. Тут цудоўныя гледачы і мы іх вельмі любім. А яны нас.

**— Вас, убачыўшы раз, цяжка потым пераблытаць з кімсьці іншым, дзякуючы як рэпертуару, які розны на кожным канцэрце, так і касцюмам, што дапамагаюць утвараць святочную атмасферу. Таму вам заўсёды спадарожнічае поспех.**

— Так, але мы ішлі да гэтага праз доўгі пошук. Бо беларуская песня, на нашу думку, надзвычай шляхетная. Таму свае касцюмы мы рабілі па малюнках часопісаў 19-га стагоддзя і яны поўнасцю адпавядаюць тым уборам, што насіла наша тутэйшая беларуская шляхта ў мінулым стагоддзі. Рэпертуар жа наш бярэцца са старадрукаў, бо фальклор зараз збіраць — справа дарэмная. Бабулькі вясковыя цяпер калі і пяюць старадаўнія песні, то лад у іх больш сучасны, адаптаваны да таго, што чуюць яны па радыё і тэлебачанні. Таму наш кіраўнік, Лявон Махнач, заўсёды шукае тэксты ў бібліятэцы, знаходзіць нешта новае. А потым знаходкі ў нашым выкананні мы прапануем гледачу. У нас таксама вельмі добрая аркестровая група. Ёй кіруе дачка Лявона Махнача, студэнтка 4-га курса кансерваторыі, таму нават у барабан мы б'ем па нотах.

**— Акрамя таго, што вы сталі своеасаблівай візітоўкай БДУ, вы знаходзіце час займацца і творчасцю, і навукай. Як гэта суадносіцца паміж сабой?**

— Асабіста я адчуваю сябе навукоўцам тады, калі выкладаю на фізфаку вышэйшую матэматыку. Акрамя гэтага, мне прыемна, што я быў у аўтарскім калектыве, які стварыў першы нацыянальны беларускамоўны падручнік па вышэйшай матэматыцы. Да гэтага былі толькі пераклады рускамоўных выданняў, зробленыя філолагамі, а не матэматыкамі. А жыццё ў калектыве — гэта ўжо іншая справа. Тут галоўная задача — перадаць тое, што мы назапасілі, нашым дзеткам — нашай змене. І перадача адбываецца самым натуральным шляхам — праз жыццё, бо мы ніколі не адштурхоўваем ад сябе сваіх малодшых, яны разам з намі падчас канцэртаў і рэпетыцый, гастрольных выступленняў. Спачатку дзесьці год я з некаторымі сваімі цяперашнімі калегамі праспяваў у хоры, потым вырашылі стварыць свой калектыў. У свой час былі як агітбрыгада, ездзілі па многіх калгасах Валожыншчыны, неаднаразова выступалі на геастанцыі. А калі пачаліся больш сур'ёзныя справы, то шмат дзе выступілі з канцэртамі, былі нават у Нарвегіі. Падчас сваіх вандровак сустракаліся з мноствам цікавых людзей, напрыклад, з Вольгай Іпатавай, Янкам Брылём. Былі мы пасля рэстаўрацыі ў Мірскім замку, дзе нам вельмі спадабалася і дзе мы жадаем зрабіць свой новы відэакліп, праспяваўшы пад старажытнымі сценамі старажытную беларускую песню. У нашым калектыве творчасць і навука спалучаецца вельмі арганічна, бо мы працуем на беларускай мове і выводзім ў свет нашу беларускую песню, найпрыгажэйшую ў Свеце. Калі ў Расіі ці ў Польшчы ёсць нешта падобнае да нашага шматгалосся, то ў Нарвегіі дзякуючы нашаму калектыву гэта пабачылі і пачулі ўпершыню, і беларускае шматгалоссе ў выкананні "Тутэйшай шляхты" ім вельмі спадабалася. Як падабаецца і нашым гледачам. Менавіта для іх мы і працуем увесь час, менавіта для іх мы выводзім у Свет нашу надзвычай шляхетную, надзвычай цікавую і непаўторную беларускую песню.

Вось такая адбылася святочная размова ў атмасферы надыходзячых свят. А мне застаецца толькі пажадаць нашаму выдатнаму калектыву — "Тутэйшая шляхта" — новых поспехаў у надышоўшым годзе і здзяйснення ўсіх планаў, каб вынікі працы і пошукаў гэтага гурту радавалі як гледачоў, так і саміх артыстаў.

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ,*
*адказны*
*за інфармацыйны сектар*
*маладзёжных арганізацый*
*геафака*

# Блакітная модніца

Праз вякі і тысячагоддзі пранесла чалавецтва любоў да каменя таму, што камень увасабляе вечнасць, непахіснасць, заўсёднасць.



*Падвеска з каменем нестандартнай бірузы*

Вандруючы па лабірынтах падземнага царства, сёння мы сустракаемся з бірузой, адной з самых прыгожых з глыбокай даўніны і да нашых дзён прывабнай прынцэсай, якая заўжды была ў пашане, карысталася асаблівай папулярнасцю і была модніцай. Біруза ў перакладзе з іншых моў азначае камень шчасця, удачы і перамогі. Любімы камень Усходу, свяшчэнны камень Тыбету, камень фараонаў, нябесны камень амерыканскіх індзейцаў. Найбольш папулярная яна ў мусульманскім свеце, адзін толькі позірк на камень прыраўноўваўся з дакрананнем да свяшчэннага Карана. Вельмі высока яна цанілася ў краіне ацтэкаў, дзе пры раскопках былі знойдзены больш за 50 відаў розных упрыгожванняў. У народаў Паволжа, Каўказа і Сярэдняй Азіі біруза была абавязковым каменем у вясельным убранні. Гэты звычай зараз аднавілі ў ЗША. Нават прымаўка ёсць такая: не пабяднее тая рука, на якой знаходзіцца пярсцёнак з бірузой. І яшчэ лічылася: калі ўладальнік упрыгожванняў з бірузы ўбачыць у іх маладзік, то гэты камень у наступным месяцы прынясе шчасце і ўдачу.

Біруза — водны фасфат медзі і алюмінію. Колер залежыць ад колькасці і характару дамешкаў іншых мінералаў, ён мяняецца ад нябесна-блакітнага, блакітнага, яблычнага да шэра-зялёнага. Камень не вельмі цвёрды, таму лёгка апрацоўваецца. Назва ідзе ад персідскага слова "фіруза", што азначае "пераможны", "дабратворны". У Еўропу біруза трапіла ад персаў і туркаў, таму і называлася "туркіз". Сустракаюцца і другія назвы — сінонімы: камень арабскі, камень ацтэкскі, камень нябесны, шпат лазаравы, агапіт і інш. На жаль, у наш час, асабліва ў краінах Еўропы, шырока выкарыстоўваецца сінтэтычная біруза (даволі блізкая па ўласцівасцях да прыроднай) і імітацыя бірузы. Іншы раз пакрываюць натуральную бірузу плёнкамі прыгожых ярка-блакітных арганічных палімераў, альбо надаюць ёй высакародную прапіткай вадкім пластыкам ці воскам (на сусветным рынку яе больш за 60 працэнтаў). З даўніх часоў за бірузу выдаваўся аданталіт пад назвай "касцяная біруза". Гэта скамянелыя рэшткі касцей і зубоў розных жывёл, іх можна выявіць пад мікраскопам па характэрнаму малюнку касцей. Як бачым, дыягнаставаць бірузу вельмі цяжка ў сувязі з вялікай колькасцю падробак.

У даўніну ведалі, што біруза "памірае" ад алею (расліннага), "ажывае" ад тлушчу (жывёльнага), таму і "лячылі" яе курдзючным салам. Яшчэ ёсць адзін экзатычны спосаб "ажывіць" камень — пацерці яго сырым мясам ці запіхнуць у валляк індыку. Чаму гэта так адбываецца? Таму, што біруза ў прыродзе няўстойлівая ды яшчэ порыстая, яна лёгка ўтрымлівае тлушчы і араматычныя рэчывы — мыла, крэмы, амаль увесь парфумны асартымент. Яе нельга апускаць нават у ваду.



*Брошка, завушніцы і пярсцёнак з бірузой*



*Брошка з бірузой*

Такім чынам, уладальнікі бірузы, ведаючы фізіка-хімічныя ўласцівасці, могуць засцерагчы камень ад састарэння. Як бачым, камень цікавы, таму і складзена безліч легендаў, прыгожых паданняў. Вось адна з іх, якую апісаў Амар Хаям. Аднойчы ўладар Шахрыяр сядзеў у садзе каля палаца. На руцэ ў яго быў прыгожы пярсцёнак з бірузой. У адзін момант аднекуль прыляцела страла і трапіла ў камень пярсцёнка. Камень адразу пацямнеў і ўпаў на зямлю. Задумаўся ўладар: што ж гэта магло азначаць? Спытаў у сваіх мудрацоў, але ніхто не ведаў, а калі і ведаў, дык баяўся сказаць праўду. Няшмат часу прайшло з таго здарэння, і памёр шах, і згублена было яго царства. Так яно было ці не, але зараз вядома, што біруза можа мяняць колер тады, калі чалавек доўга хварэе (уздзейнічаюць на камень мікробы і бактэрыі).

Радовішчы бірузы вядомы ва многіх раёнах свету, але найбольш высакаякаснай лічыцца нішапурская біруза (з Паўночнага Ірана), амаль гэтак жа цэніцца на сусветным рынку камень з радовішчаў Сіная. Са старажытных часоў здабываецца біруза ў Кітаі, славяцца на ўвесь свет і вырабы кітайскіх майстроў. Амерыканскія радовішчы даюць бірузу ніжэйшай якасці, ёсць яна ў Сярэдняй Азіі, Арменіі, нядаўна адкрыта радовішча на Палярным Урале. Сустракаецца біруза ў Афганістане, Аўстраліі, Чылі, Эфіопіі, Танзаніі, Судане, Германіі, Польшчы і Вялікабрытаніі. У апошні час знойдзена біруза ў Манголіі і Балгарыі.

Калі вы завітаеце ў наш музей на геаграфічны факультэт, пазнаёміцеся з бірузой Паўднёвага Казахстана і Паўночнага Таджыкістана. Вывучайце каменнае царства, яно дазваляе зразумець, што прырода, гісторыя, навука, культура цесна пераплятаюцца, і невыпадкова напісана шмат захапляльных радкоў пра надзвычай цікавы свет самацветных камянёў. Будзьце заўжды здаровымі, і няхай біруза застаецца прывабнай і дорыць усім любоў.

*Валянціна СМАЛЯКОВА,*
*геолаг музея землязнаўства БДУ*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6
Ум. друк. арк. 1
Падпісана да друку ў 12.00

27 студзеня
Зак. 44.
Т. 1000 экз.

Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 2206827.

Рэдактар Т.М. КАЗАК

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Камп'ютэрная вёрстка Яўгена Балаша